**30.6. Транспарт і знешні гандаль. Турызм.** Вядучую ролю ў транспартных сістэмах усіх краін адыгрывае марскі транспарт. Нарвегія ўваходзіць у лік краін свету, якія валодаюць самым магутным гандлёвым флотам. Паміж галоўнымі партамі краін рэгіёна і суседніх дзяржаў наладжаны рэгулярныя паромныя пераправы, якія ажыццяўляюць перавозкі пасажыраў (мал. 113).



Мал. 113. Паромная пераправа паміж партамі рэгіёна

Аснову экспарту краін складаюць нафта і нафтапрадукты, піламатэрыялы, цэлюлоза і папера, прадукцыя машынабудавання (судны і аўтамабілі), жалезная руда, а таксама харчовыя тавары (рыба і рыбапрадукты, алей, сыры, напоі).

Маляўнічыя ландшафты, высокі ўзровень жыцця і палітычная стабільнасць робяць краіны Паўночнай Еўропы аднымі з найбольш прывабных для развіцця ***міжнароднага турызму***.

**Абагульнім і запомнім.** Для насельніцтва краін характэрныя нізкі натуральны прырост і працэсы старэння. Асноўная частка ВУП краін фарміруецца ў сферы паслуг. У прамысловасці краін рэгіёна вялікае значэнне маюць традыцыйныя галіны, звязаныя з выкарыстаннем прыродных рэсурсаў.

***Праверым сябе.*** 1. На якія прыродныя рэсурсы багатыя краіны рэгіёна і якія традыцыйныя галіны гаспадаркі атрымалі тут развіццё? 2. Якія асаблівасці дэмаграфічных працэсаў у краінах рэгіёна? 3. Чым абумоўлена развіццё ў Нарвегіі алюмініевай прамысловасці? 4. Чаму жывёлагадоўля адыгрывае вядучую ролю ў сельскай гаспадарцы краін рэгіёна?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Даведайцеся ў сваіх сваякоў і сяброў, з якой прадукцыяй, вырабленай у Швецыі, Нарвегіі, Даніі, яны знаёмыя.

**Абмяркуем.** Як вы лічыце, ці захаваюцца ў аглядней будучыні традыцыйныя галіны гаспадаркі краін Паўночнай Еўропы ў сувязі з узрастаннем патрабаванняў да аховы навакольнага асяроддзя?

## § 31. Літва, Латвія, Эстонія

***Успамінаем.*** *Якімі асаблівасцямі характарызуецца эканоміка-геаграфічнае становішча краін Паўночнай Еўропы?*

***Разважаем.*** *Які ўплыў на спецыялізацыю гаспадаркі аказвае прыморскае становішча?*

с. 56

**31.1. Эканоміка-геаграфічнае становішча, прыродныя ўмовы і рэсурсы.** *Літва*, *Латвія* і *Эстонія* — невялікія па памерах тэрыторыі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

краіны Паўночнай Еўропы на ўсходнім узбярэжжы Балтыйскага мора (прыбалтыйскія дзяржавы, або краіны Балтыі). Латвія і Літва — непасрэдныя суседзі Беларусі. Клімат умераны марскі, спрыяльны для вядзення сельскай гаспадаркі. Больш за 40 % тэрыторыі пакрыта лясамі. З мінеральна-сыравінных рэсурсаў запасамі сланцаў вылучаецца Эстонія. На ўзбярэжжы Балтыйскага мора вядзецца здабыча бурштыну (мал. 114).



Мал. 114. Бурштын — «слёзы мора»

Прыморскае становішча, прыродныя ўмовы, суседства з рознымі па ўзроўні эканамічнага развіцця краінамі абумовілі гаспадарчую спецыялізацыю краін Балтыі. Праз іх тэрыторыю праходзяць найважнейшыя транспартныя шляхі паміж краінамі Усходняй і Заходняй Еўропы, акваторыямі Балтыйскага і Паўночнага мораў. Паромныя пераправы найбольш кароткім шляхам злучаюць прыбалтыйскія дзяржавы з краінамі Паўночнай Еўропы, Польшчай і Германіяй.

**31.2. Насельніцтва.** Агульная колькасць насельніцтва ў трох краінах — каля 6 млн чалавек (Літва — 2,8 млн, Латвія — 1,9 млн, Эстонія — 1,3 млн). Дэмаграфічная сітуацыя ва ўсіх краінах характарызуецца як неспрыяльная. Ужо доўгі час адбываецца натуральнае змяншэнне насельніцтва (смяротнасць перавышае нараджальнасць). Назіраецца таксама міграцыйны адток насельніцтва. У выніку колькасць насельніцтва ўсіх трох краін скарачаецца. Сярэдняя шчыльнасць па еўрапейскіх мерках невысокая — 30–40 чал./км$^2$. Размешчана насельніцтва нераўнамерна: найбольш шчыльна заселены ўзбярэжжа і тэрыторыі вакол сталіц. Усюды высокі — каля 70 % — узровень урбанізацыі. Найбуйнейшымі па колькасці гарадамі з'яўляюцца сталіцы: *Рыга*, *Вільнюс* і *Талін*. У нацыянальным складзе пераважаюць этнічныя групы, якія далі назвы краінам: у Літве літоўцы складаюць 83 %, у Эстоніі эстонцы — 70 %, у Латвіі латышы — каля 60 %. Для ўсіх краін характэрны працэс старэння насельніцтва.

**32.3. Гаспадарка.** Эканамічныя рэформы, ажыццёўленыя пасля распаду СССР, спрыялі пераўтварэнню Латвіі, Літвы і Эстоніі ў дзяржавы з постіндустрыяльнай структурай гаспадаркі. У сектары паслуг ствараецца каля 70 % ВУП гэтых краін. Вышэй за ўсё доля прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў Літве (адпаведна 31 і 6 %).

с. 57

**Прамысловасць.** ***Энергетыка*** краін грунтуецца на мясцовай (гаручыя сланцы) і прывазной (нафта, нафтапрадукты, прыродны газ) сыравіне. Эстонія, якая выкарыстоўвае гаручыя сланцы, па вытворчасці электраэнергіі на душу насельніцтва знаходзіцца на ўзроўні развітых

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

краін Еўропы. У энергетыцы Латвіі вялікая роля гідраэлектрастанцый, пабудаваных на р. Даўгаве. У Літве дзейнічае ГЭС на р. Нямунас. Узровень развіцця ***хімічнай прамысловасці*** больш высокі ў Літве, дзе яна грунтуецца на прывазных прыродным газе і апатытах і прадуктах нафтаперапрацоўкі. Выпрабляюцца азотныя і фосфарныя ўгнаенні, пластмасы і вырабы з іх. У Эстоніі пры вытворчасці азотных угнаенняў і фарбавальнікаў выкарыстоўваюць мясцовыя сланцы. Развіта бытавая хімія, у Латвіі — фармацэўтыка.

с. 56

Сучаснае ***машынабудаванне*** пераважна неметалаёмістае. Прадукцыя машынабудавання — радыётэхніка, прыборы і абсталяванне для прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Вядуцца суднабудаванне і суднарамонт. ***Дрэваапрацоўчая*** і ***цэлюлозна-папяровая прамысловасць*** спецыялізуюцца на вытворчасці мэблі, паперы, будаўнічых вырабаў і канструкцый з дрэва. Прадукцыя ***лёгкай прамысловасці*** разнастайная — тэкстыльныя, трыкатажныя, швейныя вырабы, абутак. Ва ўсіх буйных гарадах Латвіі вырабляюць ільняныя тканіны. У ***харчовай прамысловасці*** развіты мясная, малочная і рыбная галіны. Лоўля рыбы вядзецца ў Балтыйскім моры і Атлантычным акіяне. Галоўнымі эканамічнымі цэнтрамі краін з'яўляюцца сталічныя гарады — Рыга, Талін, Вільнюс.



Мал. 115. На малочнай ферме ў Латвіі

**Сельская гаспадарка** краін Балтыі фермерскага тыпу з прыватным землеўладаннем. Вядучая галіна — ***жывёлагадоўля*** — спецыялізуецца на развядзенні буйной рагатай жывёлы малочнага (мал. 115), малочна-мяснога напрамкаў і свінагадоўлі (у тым ліку беконнай). Пагалоўе свіней перавышае пагалоўе буйной рагатай жывёлы. Па вытворчасці малака на душу насельніцтва краіны займаюць пазіцыі лідараў у свеце. Раслінаводства спецыялізуецца на вытворчасці кармавых, збожжавых і тэхнічных культур, гародніны. Каля 50 % пасяўных плошчаў адведзена пад кармавыя культуры. Са збожжавых апрацоўваюць ячмень і пшаніцу.

У Латвіі і Літве шырока распаўсюджаны пасевы лёну-даўгунцу і цукровых буракоў. Паўсюдна вырошчваюць бульбу і гародніну.

Прыбалтыка — гэта своеасаблівы турысцкі рэгіён. Да турысцкіх рэсурсаў Латвіі варта аднесці перш за ўсё Рыгу, Юрмалу і Сігулду. Вільнюс — сталіца Літвы, найбуйнейшы горад рэспублікі, прамысловы і культурны цэнтр. Важным яго архітэктурным ансамблем з'яўляецца Стары горад з вежай Гедыміна на Замкавай гары (мал. 116).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне








Мал. 116. Від на гістарычныя цэнтры сталіц краін Балтыі:
Талін (*а*); Рыга (*б*); Вільнюс (*в*)

**Абагульнім і запомнім.** Найважнейшай асаблівасцю эканоміка-геаграфічнага становішча Літвы, Латвіі і Эстоніі з'яўляецца шырокі выхад гэтых краін да Балтыйскага мора. Для дэмаграфічнага развіцця краін характэрныя натуральнае змяншэнне насельніцтва і агульнае памяншэнне яго колькасці. Аснову ВУП краін рэгіёна складаюць віды дзейнасці сферы паслуг. У гаспадарцы краін важную ролю адыгрываюць галіны, звязаныя з морам: суднабудаванне, рыбная прамысловасць, марскі транспарт, турызм.

***Праверым сябе.*** 1. У чым асаблівасць геаграфічнага становішча Літвы, Латвіі і Эстоніі? 2. Якія асаблівасці дэмаграфічнай сітуацыі ў краінах Балтыі? 3. Які ўплыў на размяшчэнне насельніцтва і спецыялізацыю гаспадаркі аказвае прыморскае становішча рэгіёна? 4. Якія галіны складаюць аснову прамысловай вытворчасці краін Балтыі? 5. Якімі асаблівасцямі характарызуецца сельская гаспадарка краін Балтыі?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Выкарыстоўваючы карты атласа, растлумачце, чаму перавага ў экспарце грузаў з Беларусі аддаецца партам краін Балтыі, а не Расіі ці Украіны.

## § 32. Краіны Заходняй Еўропы. Германія

***Успамінаем.*** *Якія асаблівасці федэратыўнай формы палітыка-тэрытарыяльнага ўладкавання дзяржаў?*

***Разважаем.*** *Якое значэнне для Германіі мела аб'яднанне ў 1990 г. ФРГ, ГДР і Заходняга Берліна?*

**32.1. Краіны Заходняй Еўропы.** У склад рэгіёна Заходняя Еўропа ўваходзяць найбольш развітыя ў сацыяльна-эканамічных адносінах краіны. Для іх характэрная гаспадарка постіндустрыяльнага тыпу. За кошт відаў дзейнасці сферы паслуг фарміруецца больш за 70 % ВУП гэтых краін.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне